УДК 39

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ КАЛЯНДАРНАЯ АБРАДНАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ АРШАНСКАГА РЭГІЁНУ: ВЯСНАВОГА ПЕРЫЯДУ

***Я.А. ЕЎТУШЭЎСКІ***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, дац. У.А. ЛОБАЧ)***

*Вяснавы перыяд звязаны з пачаткам сельскагаспадарчых работ, узворванняў зямель, пасевам - росквітам, адраджэннем прыроды. Сімволіка росту і паспявання, уласцівая звычаям і абрадам вясновага цыклу, мела непасрэднае дачыненне не толькі да прыродных, але і да біясацыяльных працэсаў, з'яўляючыся метафарычнай праявай гатоўнасці дзяўчат да ўступлення ў шлюб. Рытуальныя функцыі дзяцей і старых мелі апасродкаванае дачыненне да сферы урадлівасці, збліжаючыся на семантычным узроўні абрадавай “чысціні”. Стадыі чалавечага жыццёвага і прыроднай цыклаў знаходзіліся ва ўзаемазалежнасці і узаемаабумоўленасці, што адлюстроўвала тэндэнцыю да іх сінхранізацыі, што ляжала ў аснове ўзаемадзеяння этнічных супольнасцяў традыцыйнага тыпу і навакольнага асяроддзя*

**Вялікдзень.** Адным з самых галоўных хрысціянскіх святаў у Беларусі з'яўляецца Пасха (ці Вялікдзень). Гэта свята звязана з вялікай колькасцю самых розных абрадаў і традыцый, многія з якіх выконваюцца і цяпер. Падрыхтоўка да Вялікадня заўсёды пачынаюць загадзя. За тыдзень да свята вернікі адзначалі Вербніцу – дзень, калі свяцілі галінкі вярбы. Наогул, увесь тыдзень перад Вялікаднем называюць Вербным. Асвячонай вярбой лёгенька білі ўсіх членаў сям'і са словамі «Не я б'ю, вярба б'е, за Тыдзень Вялікдзень» або «Вярба крыж б'е да слёз, не я б'ю, вярба б'е, няхай на здароўе жыве!» Потым гаспадар абыходзіў сваю сялібу і ўтыкаў галінку вярбы ў шчыліны і тры разы хвастаў ўсіх хатніх жывёл. З галінкамі вярбы абыходзілі поле і агарод, утыкаючы іх у зямлю. Лічылася, што яны будуць ахоўваць здароўе і дабрабыт сям'і, а таксама аберагаць ад усялякіх бед і непрыемнасцяў. Напрыклад, падчас навальніцы асвячоныя галінкі вярбы ставілі на вакно, каб адвесці ўдары маланкі [3, с. 425].

Увесь Вербны тыдзень быў напружаным, асабліва для жанчын. Трэба было нарыхтаваць вельмі шмат ежы, так як заканчваўся пост. Сярод абавязковых страў былі фарбаваныя яйкі, кулічы і паска. З асаблівай дбайнасцю прыбіраўся дом: мылі падлогу, сцены, лавы, стараліся пабяліць печ. У Чысты чацвер да ўзыходу сонца ўсе хадзілі ў лазню, каб забяспечыць чысціню і здароўе на ўвесь бягучы год. У якасці магічнага сродку ў ваду клалі срэбраную манету, якая мусіла гарантаваць здароўе [5, с. 35].

Пятніца лічылася спрыяльным днём для выпечкі чорнага хлеба. У суботу ж уся прыгатаваная ежа складалася ў пляцёнку, якую неслі асвячаць у царкву. У царкву ішлі ўсе дарослыя, дома заставаліся толькі дзеці і старыя. На ўсяночную стараліся апрануцца як мага прыгажэй і святочна. Існавала прымета, што першы чалавек, які выйдзе з храма на вуліцу пасля ўсяночнай службы, будзе самым удачлівым і шчаслівым [6, с. 78].

Асвячаць неслі не толькі паску, кулічы і яйкі, але тварог і мяса. Яйкі фарбавалі ў асноўным у шалупінні цыбулі, што надавала насычаны чырвоны колер – сімвал нараджэння і жыцця. Калі кошык прыносілі з царквы, то асвячонае яйка клалі ў ваду, якой потым мыліся. У Аршанскім рэгіёне бытаваў звычай, калі “дзяўчыны гладзілі твар гэтым яйкам, каб быць прыгожымі і здаровымі”[14].

Першым, што павінны былі паспрабаваць усё, хто сабіраўся за святочным сталом, было асвячонае яйка. Яго разрэзалі на кавалачкі, і кожны член сям'і павінен быў з'есці яго. У першы дзень Вялікадня ніхто не пазычаў грошы, гэта лічылася дрэннай прыметай.

Улюбленай забаўкай на Вялікдзень была гульня ў біткі: правяралі, чыё яйка мацней. Акрамя таго ў Аршанскім рэгіёне любілі катаць яйкі: калі яйка кацілася з грудка і збівала іншае, то гулец забіраў яго сабе.[15]

Вечарам па хатах хадзілі валачобнікі і спявалі велікодныя песні, у якіх, калі іх адорвалі, ўсхвалялі гаспадароў, жадалі ім шчасця і дабра ў іншым выпадку спяваліся песні пра «дрэнных гаспадароў». Завяршыўшы абрады, валачобнікі збіраліся ў хаце аднаго з удзельнікаў і дзялілі сабранае, аддаючы вялікую частка «пачынальніку».

---

[14] Зап. Шпакоўскі Вячаслаў Уладзіміравіч, у 2007г. ад Франковай Вольгі Сцяпанаўны, 1927 г.н., у в. Балбасава, Аршанскага р-на.

[15] Зап. Шпакоўскі Вячаслаў Уладзіміравіч, у 2012г. ад Ляшнеўской Галіны Яўгенаўны, 1946 г.н., у в. Белева, Аршанскага р-на.

Характэрным атрыбутам Вялікоднага абраду з'яўляецца песня. Як прыклад, песня з Аршанскага раёну “А з-пад лесу, лесу цёмнага” запісаная ў 1970 годзе.

“*А з-пад лесу, лесу цёмнага, / Вясна красна на ўвесь свет! / А з-пад гаю, з-пад зялёнага / Вясна красна на ўвесь свет! / Ці не тучка йдзець, ці не воблачка? / А йшлі ж тудой валачобнікі, / Валачобнікі — людзі добрыя. / А йшлі ж яны, шаталіся, / Вялікага сяла пыталіся, / Вялікага сяла, багатага двара, / Багатага двара пана Іванькі. / Ці ты дома, пане Іванька? / Хоць ён дома, ён не акажацца – / К вялікаму святу прыбіраецца, / Абуваець боты шаўровыя, / Надзяець шатры па самыя пяты, / Падпяразаіць ды каван пояс. / Прыбраўшыся, ён сеў сабе / За столікам за цясовенькім, / За скацерцю за бялёвенькай. / Перад ім стаяць чатыры кубкі, / Маляваненькіх, наліваненькіх. / У адным кубку – зеляно віно, / У другім кубку – пшоннае піва, / У трэцім кубку – саладок мядок, / У чацвёртым кубку – горка гарэлка. / Зеляно віно – для самога пана, / Пшоннае піва – для жаны яго, / Саладок мядок – для дзяцей яго, / Горка гарэлка – для суседзь яго*” [2, с.174].

Асаблівая роля адводзілася ўдовам ў гэтым абрадзе. Далей прыведзены прыклад велікодная удовінай песні. “*Зайшло сонца за ваконца за зялёненькі садок / Прыйді прыйдзі мой міленькі хоць на час на гадзінку / Ляжам спаці ў карваці рвскажу цябе я сон / Сон пра цябе сон пра мяне, сон пря нашу пра Любоў / Чаго мілка позна ходзішь ня баішься мертвяцоў / Чаго я буду баяцца, там мой мілы схаранён / на Ім памітнік цяжёлы на 97 пудоў / на Ім крэсцік невялічкі увесь абліты Серабром*”.[16]

Дзеці таксама гулялі важную ролю ў ходзе абраду. Часцей за ўсё іх роля зводзілася да гульняў якія ў сабе неслі архаічны сэнс. Як прыклад, гульня «Заяц». У яе гулялі на Вялікдзень у Аршанскім рэгіёне. «Дзеці становяцца ў круг, у цэнтры становіцца «заяц» пакуль дзеці спяваюць спецыяльную песню заяц абавязаны рабіць усё што яму ў ёй гаворыцца». Далей прыклад гульнявой песні «*Заінька ідзе быў / Шэрэнькі ідзе быў / Ай прыгаў па гародзе / Ай прыгаў па гародзе / Заінька, што дзелаў? / Шэрэньк,і што дзелаў / Ай, капусту там я грыз / Ай, капусту там я грыз / Заінька, чым білі? / Шэрэнькі, чым білі? / Ай, білі, кулаком, / Ай, білі, кулаком. / Заінька, як уцякаў? / Шэрэнькі, як уцякаў? / Ай, уцякаў я прыг, прыг, прыг / Ай, уцякаў я прыг, прыг, прыг*».[17]

У цэлым гэты дзень замяніў усе ранейшыя язычніцкія традыцыі, дзякуючы сваёй важнасці як асноўнага царкоўнага свята. Таму аснова архаічных традыцый знікла. У разглядаемы перыяд абрад было шмат спробаў знішчыць яго з абрадавых святкаванняў насельніцтва. Гэта было звязана як і з палітыкай камунізма так і з атэістычнай праграмай партыі бальшавікоў. Нягледзячы на гэта, ён захаваўся, хоць шмат у чым была страчана рэгіянальная асаблівасць яго правядзення, што ўскладняе яго вылучэнне сярод іншых каляндарных свят як унікальнага абраду. Таксама варта разумець, што царкоўная палітыка перашкаджала з'яўленню адрозненняў у святкаванні гэтых абрадаў з-за страху страты царкоўных канонаў і рэлігійных правілаў.

**Саракі.** У канцы сакавіка – у дзень веснавога раўнадзенства 22 сакавіка – святкуюць Саракі. Саракі з'яўляюцца адным са знамянальных дзён у народнай традыцыі: лічыцца што да гэтага часу ў родныя краю вяртаюцца “40 выраяў”. Святкаваць яго шырока, напрыклад, як Масленіцу, не было магчымасці. Усё-ткі да новага ўраджаю яшчэ далёка, а ад старога – мала што засталося [7, с. 205].

З гэтага свята дзень ужо быў роўны ночы, а потым з кожным днём станавіўся больш яе. І беларусы шанавалі гэтую падзею, вешчавала хуткі сыход зімы і ажыўленне прыроды. Людзі стамляліся ад халадоў і маразоў, чакалі вясну. А пасля Саракоў гэта было ўжо лягчэй, таму што цёплых дзён станавілася больш, сонца з'ўлялася на небе часцей. У Аршанскім рэгіёне рытуалы, прынятыя на Саракі, трохі падобныя на рытуалы Гукання вясны. І там, і там мэта адна – хутчэй заклікаць цяпло.

Свята пачыналася рана раніцай, калі гаспадыня пачынала пячы “сорак жаваранкаў”. Вітаючы птушак, якія вярнуліся з свету продкаў і якія прынеслі вестку пра тое, што зіма ўжо ззаду, жанчыны выпякалі з цеста – печыва, булачкі ў выглядзе птушак. Выбар «жаўрука» залежаў ад тых традыцый, якія існавалі на той ці іншай тэрыторыі, а таксама ад фантазіі гаспадыні і дастатку сям'і. Для Аршанскага рэгіёну было характэрна печыва з салодкага цеста, якое па форме нагадвае птушку ў профільным выглядзе [4, с. 306]. Першы жаўрук заўсёды кідаўся ў агонь – гэта была ахвяра сонцу, што служыла чалавеку. Рытуальнай выпечкай потым частавалі адзін аднаго, кармілі хатніх жывёл, а ў некаторых вёсках нават закопвалі на полі, каб быў ураджайны год [12, с. 385].

Акрамя таго, вялікая ўвага надавалася на Саракі лёду. З гэтым нават была звязана народная прыкмета: “Калі на Саракі вол в волю нап'ецца вады з расталых лядышак, то будзе добрая вясна”[18].

[16] Запісаў аўтар (ЗА) у 2016г. ад Франковай Вольгі Сцяпанаўны, 1927 г.н., у в. Балбасава Аршанскага р-на.
[17]ЗА у 2016г. ад Франковай Вольгі Сцяпанаўны, 1927 г.н., у в. Балбасава Аршанскага р-на.
[18] ЗА у 2017г. ад Паўлючэнка Ларысы Аляксандраўны, 1953 г.н., у в. Коханава Аршанскага р-на.

У дзень вясновага раўнадзенства пажылыя людзі прадказвалі надвор'е. Да прыкладу, калі ўжо пачалася паводка, то вясна будзе хуткай. Такое ж вялікае значэнне надавалі і прылёту птушак, якія прыносілі вясну. Існаваў шэраг і іншых народных прыкметаў. Напрыклад, калі на Сарокі – мароз, то наперадзе яшчэ будзе сорак маразоў: гэта значыць вясна будзе позняя і халодная. Калі ў гэты дзень на дахах яшчэ ляжыць снег, то і на Дабравешчанне (у канцы сакавіка-пачатку красавіка) таксама будзе снег, а ў некаторых месцах ён можа праляжаць і да Юр’я (канец красавіка-пачатак мая) [9, с. 103].

Людзям так хацелася цяпла і сонца, што яны выконвалі розныя рытуалы, якія, на іх думку, маглі паскорыць прыход вясны. У Саракі любімай забавай было качацца на арэлях - «гушкацца». Пры чым, усе стараліся ўзлятаць як мага вышэй, каб і лён вырас высокім [7, с. 106].

Яшчэ ў гэты дзень было прынята праводзіць варажбы. Сустракаюцца згадкі пра незвычайную варажбу, якая праводзілася ў Аршанскім рэгіёне. Маладыя дзяўчаты пяклі сорак піражкоў, потым кожная пазначала свае. Выпечка раскладалася на парозе, а потым у дом запускалі сабаку. Чый піражок ён браў першым, тая дзяўчына хутчэй пойдзе замуж [5, с. 26].

Паходжанне гэтага свята тлумачаць з двух пазіцый: з пазіцыі хрысціянства і паганства. Па хрысціянскім календары 22 сакавіка былі пакараныя сорак Севастийских ваяроў. Ёсць у гэтага свята і паганскія карані: лічыцца, што звязаны ён з сарака цёмнымі сіламі, якія, па павер'і, скоўваюць зімой зямлю. А чалавек сваімі дзеяннямі падкрэсліваў, што ён мацнейшы гэтага, што вясна і цяпло – на яго баку.

**Юр'е.** Важным святам веснавога цыкла для беларусаў заўсёды быў Юр'еў дзень, які адзначаюць 6 мая. Менавіта ў гэты дзень першы раз выганялі жывёлу на пашу, купаліся ў расе. Па народных павер'ях Юрый – апякун пастухоў, а свята гэта – адно з галоўных у земляробчым календары. Таму ўсе пастухі хадзілі ў царкву на святога Юрыя, каб заступнік не абмінуў іх увагай. Сяляне Аршанскага рэгіёну ў гэты дзень рыхтавалі аўсяны кісель [3, с. 308].

Юр'еў дзень святкуецца ў такі час, калі пачынае з'яўляцца першая трава. З гэтай нагоды была распаўсюджана ў Падняпроўе прымаўка: «Да Юр’я кармі дурня, а пасля Юр’я сам пракорміцца». Існавала меркаванне, што Юр'ева раса вельмі гаючая, яна дапамагае і скаціне, і чалавеку. У лячэбную сілу гэтай расы верылі нашы продкі, яна заключалася ў тым, што “Юрый адчыняў ў гэты дзень зямлю ключамі Госпада, выпускаў жыццятворныя сокі”. У некаторых вёсках такой расой лячыліся, мазалі балючыя месцы – асабліва вочы. А на суседняй Віцебшчыне ёю абмывалі кароў [6, с. 58].

На Юр’я самай галоўнай персонай у вёсцы быў пастух. Яму давалі каўбасу, яйкі, масла, сала, а потым грошы і гарэлку. Калі пастух выганяў статак за вёску, ён абыходзіў яго тройчы з абразом святога Георгія, хлебам, яйкамі і вярбой.

Яшчэ адзін абавязковы рытуал, які выконваўся ў Юр'еў дзень на Аршаншчыне. Гаспадар павінен быў агледзець сваё поле. Ён браў свежы каравай, заварочваў яго ў чыстае палатно і прыносіў на поле, засеянае азімым жытам. Калі каравай быў вышэй сцяблінак маладога жыта, ўраджай будзе добрым. Дома гэты каравай з'ядалі ўсёй сям'ёй [4, с. 84].

Таксама з гэтым днём звязаны шматлікія народныя павер'і і прыкметы. Беларусы Аршаншчыны верылі, што “у гэты дзень нельга нікому нічога пазычаць, таму строга сачылі за тым, ніхто з чужых людзей не змог нічога ўзяць са двара. Лічылася, што нядобры чалавек, узяўшы нейкую рэч з дому, мог перацягнуць з сям'і дабрабыт”. Была і такая народная прыкмета, звязаная з надвор'ем: «Калі дождж на Юр'я, будзе хлеб і ў дурня!»[19].

**Троіца.** Сёмуха – менавіта так называюць беларусы свята Тройцы. Гэты дзень з'яўляецца адным з самых важных святаў праваслаўнага календара. Адзначаецца ён на 50-ы дзень пасля Вялікадня, таму можна пачуць яшчэ адну яго назву - Сёмуха. У беларусаў Троіца ўключана ў цэлы цыкл святочных дзён, звязаных паміж сабой. Пачынаюцца гэтыя святочныя дні ў чацвярга сёмага тыдня пасля Вялікадня, адсюль і - Сёмуха.

У гэты цыкл акрамя Тройцы ўваходзяць яшчэ такія дні, як “бацькоўская субота”, або “траецкія дзяды”, калі памінаюць памерлых продкаў. Панядзелак пасля Тройцы называецца Духаў дзень: лічыцца, што менавіта ў гэты дзень на апосталаў сышоў Святы Дух, які падштурхнуў іх прапаведаваць хрысціянства.

Адным з галоўных эліментаў гэтага свята ў Аршанскім рэгіёне быў абрад “завіванне бярозкі”. Маладыя дзяўчаты хадзілі ў лес і закручвалі на бярозе галінкі ў выглядзе вянка, упрыгожваючы іх стужкамі. Па такіх вянках прадказвалі будучыню: у той дзяўчыны, чый вянок зеланеў, жыццё будзе доўгае. Высахлыя вянкі кідаў у ваду: калі плыве, то будзе яшчэ хоць адзін год жыцця, калі ён тоне так - хуткі скон [8, с. 205].

[19] ЗА у 2017г. ад Ляшнеўскай Галіны Яўгенеўны, 1946 г.н., у в. Белева Аршанскага р-на.

Хаты ў гэты дзень было прынята ўпрыгожваць зелянінай – бярозавымі галінкамі, аерам. І ў царкву таксама ўсё неслі бярозавыя галінкі, палявыя кветкі, іх потым высушвалі і захоўвалі за абразамі. Зеляніну, якой ўпрыгожвалі хаты, пасля таго як яна высыхала, прынята было спальваць [1, с.129]. Існавала прымета, што калі на Сёмуха пахадзіць басанож па зямлі, то ногі хварэць не будуць. [10, с.396]

На другі дзень Сёмухі ў многіх вёсках Аршаншчыны праходзіў наступны абрад. У вёсцы выбіралася самая прыгожая дзяўчына, якую ўпрыгожвалі рознай зелянінай – галінкамі бярозы і клёну, кветкамі. Яна ўзначальвала шэсце. людзі з песняй абыходзілі ўсю вёску, заходзілі на панскі двор, віншавалі ўсіх з святам. За гэта ім давалі грошы ці ежу. Потым усё сабранае зносілі ў адзін дом, і пачыналася гулянка [17, с. 107].

У Аршанскім рэгіёне бытавала шмат легенд пра русалак, якія ў гэтыя дні пачынаюць свае ігрышчы. «Голыя, з доўгімі трапяткімі чорнымі валасамі і чорнымі вачыма яны бегаюць па палях і лясах, пампуюцца на галінках. хто ўбачыць іх зблізку, у таго твар назаўжды звядзе страшнай грымасай» [11, с. 76]. Можна зрабіць выснову што гэтаму святу папярэднічала нейкае больш архаічнае дзейства, звязанае з духамі і «паскуддзем» якія ў гэты перыяд пачынаюць актыўна праяўляцца.

Такім чынам, да найбольш знакавых і значных каляндарных абрадаў вяснавога перыяду у беларусаў Аршаншчыны можна аднесці Саракі, Вялікдзень (Пасху), Юр’е і Троіцу. Аднак, на сучасным этапе традыцыйныя каляндарныя святы бытуюць у значна рэдукаваным выглядзе. З другога боку, такое святы як Вялікдзень і Троіца да нашага часу з’яўляюцца надзвычай шанаванымі, што звязана з іх адметным статусам як у традыцыйнай карціне свету беларусаў, так і ў афіцыйных канонах хрэсціянскай царквы.

ЛІТАРАТУРА

1. Байбурин, А.К. Ритуал в традиционной культуре: Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов / А.К. Байбурин. – СПб. : Наука, 1993. – 240 с.
2. Веснавыя песні / склад. Г.А. Барташэвіч, Л.М. Салавей ; склад. муз. часткі В.І. Ялатаў; рэд. К.П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 608 с. Валачобныя песні / склад. Г.А. Барташэвіч, Л.М. Салавей ; склад. муз. часткі В.І. Ялатаў ; рэд. К.П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 560 с.
3. Жыцця адвечны лад: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2 / укл., прадм. і пер. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1998. – 607 с.
4. Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / уклад., класіфікацыя, сістэм. матэрыялаў і камент. А.І. Гурскага ; уступ. арт. А.І. Гурскага, А.С. Ліса. – 2-е выд., выпр. – Мінск : Бел. навука, 2003. – 429 с.
5. Свет славянскага фальклору / Р.М. Кавалёва [і інш.] ; пад рэд. Р.М. Кавалёвай. – Мінск : БДУ, 2001. – 93 с.
6. Кавалёва, Р.М. Абрысы рытуальна-магічнай сферы беларускага фальклору : зб.арт. / Р.М. Кавалёва. – Мінск : Бестпрынт, 2005. – 183 с.
7. Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы. Весенние праздники / отв. ред. С.А. Токарев. – М. : Наука, 1977. – 358 с.
8. Левкиевская, Е.Е Славянский оберег: Семантика и структура / А Е. Левкиевская. – М. : Индрик, 2002. – 334 с.
9. Лозка, А.Ю. Беларускі народны каляндар / аўт.-уклад. А.Ю. Лозка ; маст. А.І. Дашкевіч. – Мінск : Полымя, 1992. – 205 с.
10. Паэзія беларускага земляробчага календара / уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. А.С. Ліса ; рэдкал. : А. С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 613 с.
11. Сівіцкі, У.М. Русальная традыцыя беларусаў: міфапаэтычная сістэма, тыпалагічныя паралелі / У.М. Сівіцкі ; ред. А.С. Фядосік. – Мінск : Тэхналогія, 2006. – 187 с.
12. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – СПб. : Тип. имп. Акад. наук, 1902. – Т. III. – 596 с.